ЧЫМ «ХВАРЭЕ» НАШ ЛЕС

ПАВАЛЕНЫЯ ДРЭВЫ — НА ДРОВЫ

Расказаў першы намеснік міністра і пра іншыя праблемы, з якімі сутыкаецца яго ведамства ў нашых лясах. Не толькі чалавек захламляе іх, але і сама прырода — моцныя вятры апошніх гадоў ламаюць многія дрэвы.

За студзень — май гэтага года лясгасы прыбралі адходы ў лясным фондзе (на тэрыторыях, прылеглых да месцаў адпачынку, знакавых аб'ектаў, а таксама на пляцоўках уздоўж аўтамабільных дарог) на плошчы больш за 4,5 тысяч га.

А летась комплекс мерапрыемстваў па навядзенні парадку ў лясным фондзе Міністэрства лясной гаспадаркі быў выкананы ў поўным аб'ёме. У прыватнасці, добраўпарадкавана 145 месцаў адпачынку. Квартальныя прасекі расчышчаны на працягу 759 кіламетраў, пры гэтым нарыхтавана 4,8 тысячы кубічных метраў драўніны. Прыбраная захламленасць у аб'ёме 133,5 тысячы кубічных метраў. Выраблена і ўстаноўлена ў лясным фондзе, які прымыкае да аўтадарог, 5 620 шлагбаумаў, 4 687 аншлагаў на супрацьпажарную і прыродаахоўную тэматыку (на рускай і беларускай мовах), 1 259 пано і іншае.

У лясным фондзе, прылеглым да аўтамабільных дарог, высечана 31,2 тысячы кубічных метраў нежыццяздольных і сухастойных дрэў, у тым ліку ўздоўж дарог рэспубліканскага значэння — 17,3 тысячы «кубоў». Прыбраны тэрыторыі ўздоўж аўтамабільных дарог агульнай працягласцю 9 022,7 кіламетра, у тым ліку рэспубліканскага значэння — 5 261,6 кіламетра.

На працягу года для правядзення ачысткі месцаў высечак лесу ад захламленасці сельскагаспадарчымі ўстановамі шырока прыцягвалася мясцовае насельніцтва. З гэтай мэтай летась было адпушчана 1,4 мільёна кубічных метраў, у тым ліку насельніцтву — 0,7 мільёна «кубоў». Акрамя таго, арганізацыямі галіны была працягнута сістэмная работа па ўборцы бытавых адходаў на ўчастках, прылеглых да месцаў адпачынку ўздоўж аўтамабільных дарог, садовых таварыстваў і населеных пунктаў, у прыдарожных палосах. Летась прыбрана 9,5 тысячы кубічных метраў бытавога смецця.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

УСМІХНІЦЕСЯ — ВАС ЗДЫМАЮЦЬ

Адказваючы на пытанні журналістаў, першы намеснік міністра падкрэсліў: «Што датычыцца павелічэння колькасці відэакамер, якія ў тым ліку выяўляюць і парушальнікаў, вядома, мы будзем працягваць гэтую работу. Думаю, сёлета мы яшчэ дадаткова закупім каля сотні». Пры гэтым Валянцін Шатраўка адзначыў, што плануецца не толькі павялічваць колькасць фотапастак, але і выкарыстоўваць больш дасканалыя камеры. «Мы разумеем, што частка камер працуе непрацяглы час або дае такую карцінку, якую немагчыма выкарыстоўваць для прыцягнення да адказнасці ў далейшым», — дадаў ён.

Паводле слоў першага намесніка міністра, камеры з'яўляюцца эфектыўнай мерай для таго, каб, у прыватнасці, прадухіляць забруджванне лясоў бытавым смеццем. Акрамя таго, выяўляецца шмат самавольных высечак, незаконных нарыхтовак драўніны. Камеры фотафіксацыі пачалі выкарыстоўваць у сістэме Мінлясгаса з 2015 года. Цяпер іх налічваецца ўжо 637. Летась яны дапамаглі лясгасам выявіць і прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці 466 парушальнікаў, што ў 1,6 раза больш, чым за 2017 год. За пяць месяцаў гэтага года з дапамогай фотапастак выяўлены 291 парушальнік.

НЕ ПА ЗУБАХ КАРАЕДУ

Па выніках пяці месяцаў у нашай краіне назіраецца памяншэнне аб'ёмаў нарыхтоўкі драўніны пры правядзенні суцэльных санітарных высечак у сувязі з пашкоджаннем насаджэнняў жуком-караедам. «У два разы ў нас зменшыліся пашкоджанні, адпаведна, на столькі ж мы паменшылі і аб'ёмы нарыхтоўкі на такіх участках», — сказаў першы намеснік міністра. Сказаць дакладна, колькі драўніны будзе нарыхтавана такім чынам па выніках года, пакуль складана. Па словах Валянціна Шатраўкі, гэта можа быць прыкладна 60 % ад леташняга аб'ёму.

Спецыяліст адзначыў, што з моманту пастаноўкі пашкоджаных насаджэнняў на ўлік да іх высечкі павінна прайсці не больш за месяц, каб не даць распаўсюдзіцца жуку і не нанесці большую шкоду. «У сувязі з памяншэннем аб'ёмаў усыхання мы ў маі паставілі задачу да 15 чэрвеня высечы ўсе насаджэнні, пастаўленыя на ўлік да 1 чэрвеня, што і зрабілі», — адзначыў Валянцін Шатраўка. Разам з тым ён дадаў, што з чэрвеня пачаўся вылет першага пакалення шкоднікаў — жука-караеда. У сувязі з гэтым адзначаецца нязначнае павелічэнне аб'ёмаў усыхання лясных насаджэнняў па Гомельскай вобласці. Па астатніх рэгіёнах сітуацыя застаецца на ранейшым узроўні.

Што ж датычыцца ў цэлым аб'ёму нарыхтоўкі драўніны, то задача гэтага года — 23,5 мільёна кубічных метраў. «Летась было нарыхтавана 28,6 мільёна «кубоў» драўніны. Гэта рэкорд за ўвесь час нарыхтоўкі. Звычайна было прыкладна 23,5 мільёна. На гэты год мы для сябе іх і вызначылі», — сказаў Валянцін Шатраўка. Пры гэтым галоўная задача — забяспечыць краіну драўнянай сыравінай у аб'ёмах, неабходных для перапрацоўкі.

Сяргей КУРКАЧ.

ПЯРУН ПРЫНОСІЦЬ СТРАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гарачы чэрвень моцна падбавіў працы ратавальнікам, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Працяглы перыяд спякоты, якая перасягнула трыццаць градусаў, і істотны недабор дажджоў стварылі ідэальную абстаноўку для пажараў. Так, па стане на 9 ліпеня ў краіне адбылося ажно 2448 пажараў у экасістэмах. З іх 1875 прыпала на долю травы і хмызняку. У гэтую лічбу ўваходзяць і пажары, якія літаральна «пракаціліся» ў красавіку падчас выпальвання сухой леташняй травы. 404 узгаранні былі ліквідаваны ў лясах. На долю самых складаных з іх — тарфяных — прыпала 169 пажараў. Нам вельмі дапамагаюць авіятары: за першыя паўгода нашы лётчыкі здзейснілі 226 палётаў. З паветра яны засяклі 102 пажары ў экасістэмах.

Як сябе паводзіць у навальніцу?

Але нярэдкая бывае і такая сітуацыя. Дзень пачынаецца з яркай сонечнай раніцы. Слупок тэрмометра ўпэўнена паўзе ўверх і спыняецца ў раёне трыццаціградуснай адзнакі. Раптам недзе на гарызонце з'яўляецца чорная хмара. Яна набліжаецца і павялічваецца ў памерах. І праз колькі хвілін пачынаецца моцны дождж з ветрам пад акампанемент грому і з навальнічнай «падсветкай»...

Разам з тым не ўсё так сумна. Знянацку навальніца ўжо не застане. У красавіку на сайце meteoinfo.by аднавілася праца дальнабойнага метэарадара, размешчанага на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта Мінск. Радыус ахопу прылады — 200 кіламетраў. Гэта значыць, што радар «пакрывае» большую частку тэрыторыі Беларусі. Яму дапамагаюць меншыя радары, размешчаныя ў Брэсце і ў Гомелі. Усходнія раёны Беларусі, куды не дасягае радар, «прыкрываюць» комплексы, якія працуюць у расійскіх Вялікіх Луках і Смаленску.

Дзякуючы ім можна літаральна за некалькі секундаў паглядзець навальнічную абстаноўку ў краіне, ацаніць напрамак, у якім будзе рухацца атмасферны фронт, і... загадзя падрыхтавацца да гэтай небяспечнай для жыцця з'явы надвор'я.

23 чэрвеня трагедыя адбылася ў Кармянскім раёне Гомельскай вобласці. Прыкладна ў 13.40 два пастухі заганялі жывёл на лузе каля вёскі Струмень. Ударыла маланка, і адзін з пастухоў тут жа ўпаў. Напарнік падбег да яго і паспрабаваў прывесці ў прытомнасць, ды безвынікова. Мужчына выклікаў хуткую дапамогу. Але ўрачы толькі канстатавалі смерць.

Акрамя таго, у ноч на 27 чэрвеня электрычныя разрады падпалілі чатыры пабудовы на Магілёўшчыне. Час быў літаральна адзін і той жа — ад поўначы да чацвёртай гадзіны раніцы.

Часцей за ўсё маланкі б'юць у высокія кропкі, металічныя канструкцыі і ваду. Сіла току ў іх дасягае неверагодных значэнняў — да 500 тысяч ампер, а напружанне вымяраецца дзясяткамі мільёнаў вольт. Параўнайце гэта з класічнымі 220 вольтамі ў звычайнай бытавой разетцы.

— Таму лепш за ўсё навальніцу перасядзець дома, — раіць Віталь Навіцкі. — Зачыніце ўсе вокны і коміны, каб не прыцягваць шаравую маланку. Падчас «святламузыкі» за акном лепш трымацца далей ад антэн і электраправодкі. Электрапрыборы выключыце. Калі ж навальніца заспела вас у аўтамабілі, галоўнае — зачыніць вокны і нікуды з яго не выходзіць. Але калі вы сутыкнуліся з навальніцай у адкрытым полі, то сітуацыя ўскладняецца. Тут трэба прысесці і ахапіць калені рукамі — так вы будзеце менш выдзяляцца на агульным фоне і мінімізуеце плошчу магчымага кантакту. Тое ж датычыцца і лесу — маланкі часцей за ўсё б'юць у старыя высокія дрэвы. Распаўсюджаная памылка — класціся на зямлю: справа ў тым, што калі побач з вамі стукне маланка, то ўдар вы прымеце ўсёй плошчай цела. Таксама навальніца вельмі небяспечная каля вадаёмаў — дзякуючы таму што вада з'яўляецца ідэальным праваднікам электрычнасці, ток можа распаўсюджвацца на даволі вялікія адлегласці.

З балконаў, з двара прыбярыце рэчы, якія могуць быць падхоплены парывамі шквалістага ветру і кагосьці траўміраваць. Ад ліній электраперадачы, будаўнічых канструкцый варта трымацца далей. Калі ж вы ўбачылі, напрыклад, абарваны дрот — адразу ж тэлефануйце нам. Няважна, што гэта — лінія электраперадачы, кантактная сетка тралейбуса ці нешта яшчэ. Так, у грамадстве існуе меркаванне, што, магчыма, хтосьці ўжо патэлефанаваў і паведаміў пра тое, што адбылося. Мы, у сваю чаргу, прытрымліваемся думкі, што няхай лепш да нас паступіць 50 званкоў, чым ніводнага. У любым выпадку дыспетчар задасць некалькі пытанняў, якія ўдакладняць сітуацыю, і пераадрасуе званок у патрэбную структуру.

Адыходзіць ад дрота, які можа быць пад напружаннем, таксама трэба правільна. Калі ісці звычайным крокам — вас ударыць токам. Таму трэба адступаць вельмі павольна, ледзь-ледзь прыўздымаючы ступні над зямлёй.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.